# БЕЛАРУСКАЯ ЭМІГРАЦЫЯ У ПОЛЬШЧЫ

Варшава, 2023

Рапарт даследавання грамадскай думкі
для Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

# – МЕРКАВАННІ, ПАЗІЦЫІ, ДЫЛЕМЫ



# БЕЛАРУСКАЯ ЭМІГРАЦЫЯ Ў ПОЛЬШЧЫ – МЕРКАВАННІ, ПАЗІЦЫІ, ДЫЛЕМЫ

Рапарт даследавання грамадскай думкі
для Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

Варшава, 2023
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

**Апытанне**
ARC Rynek i Opinia

**Аналіз і рапарт**
Лукаш Мазуркевіч, Гжэгаж Сыгноўскі

**Уступ**
Эрнэст Выцішкевіч

**Copyright by**
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага

**Дызайн і вёрстка**
dobosz.studio

**ISBN**
978-83-66883-51-2

**Выдавец**
Цэнтр дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага
вул. Ясна 14/16А, 00-041 Варшава
тэл.+ 48 22 295 00 30
e-mail: kontakt@mieroszewski.pl
**www.mieroszewski.pl**

# Змест:


| | | |
|---|---|---|
| 1. | Уводзіны – фон і мэта даследавання | 6 |
| 2. | Інфармацыя пра даследаванне | 7 |
| 3. | **Знаходжанне ў Польшчы** | **12** |
| 4. | **Адаптацыя ў Польшчы** | **20** |
| 5. | **Моўныя пытанні** | **25** |
| 6. | **Ацэнка стаўлення суседзяў да Беларусі** | **32** |
| 7. | **Расія і расіяне** | **38** |
| 8. | Падсумаванне | 42 |

# 1. Уводзіны — фон і мэта даследавання

**Новая беларуская эміграцыя ў Польшчы — тэма менш агучаная і слабей заўважная на фоне ўкраінскіх спраў, якія ўжо больш за год запаўняюць сабой польскую інфармацыйную прастору. Гэта вынікае як з рознага маштабу гэтых з'яў (дзясяткі тысяч беларусаў у параўнанні з некалькімі мільёнамі грамадзянаў Украіны), так і са зразумелага ва ўмовах вайны засяроджвання ўвагі польскай грамадскай думкі, перш за ўсё, на ўкраінцах як на яе непасрэдных ахвярах. Аднак наплыў беларусаў, які ўзрастаў са жніўня 2020 года і ўзмацняўся разам з павышэннем рэпрэсіўнасці рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, выявіўся гэтак сама важным складнікам новага грамадскага краявіду, што ўтвараецца ў Польшчы ў сувязі з падзеямі на ўсход ад польскіх межаў.**

Бо наколькі для ўкраінцаў Польшча з'яўляецца, перш за ўсё, адным з найважнейшых напрамкаў уцёкаў ад ваенных дзеянняў, настолькі ж для большасці беларусаў, што прыязджаюць да нас, мы становімся прытулкам ад магчымых палітычных рэпрэсій, прасторай асабістай свабоды і, што асабліва важна, артыкуляцыі ўласнай нацыянальнай і моўнай ідэнтычнасці. Пагрозы для яе ў апошні час набылі непасрэдны і крытычны характар. Уцягванне Беларусі ў расійскую агрэсію супраць Украіны, балансаванне на мяжы страты суверэнітэту на карысць Расіі, маштабныя рэпрэсіі супраць праціўнікаў рэжыму, пераслед незалежных арганізацый і суполак — усё гэта робіць беларускую справу асабліва важнай і пільнай.

Менавіта такі кантэкст і характар беларускай эміграцыі паказвае апытанне беларусаў у Польшчы, праведзенае ў траўні і чэрвені 2023 года па замове Цэнтра дыялогу імя Юльюша Мерашэўскага. Гэта дадатковае апытанне да праведзенага паралельна даследавання грамадскай думкі палякаў на тэму Беларусі і беларусаў, абмеркаванага ў асобным рапарце.

Даследаванне, вынікі якога прадстаўлены ў дадзеным рапарце, мела, сярод іншага, наступныя мэты:

- выявіць прычыны, якія падштурхнулі рэспандэнтаў прыняць рашэнне аб пераездзе і ўладкаванні ў Польшчы;
- сабраць іх вопыт, звязаны з жыццём у Польшчы, ідэнтыфікаваць праблемы і выклікі, з якімі яны сутыкаюцца;
- вызначыць, як фармуюцца сацыяльныя кантакты беларусаў ў Польшчы, у якой ступені ў іх атрымліваецца наладжваць стасункі з палякамі, а наколькі яны жывуць ў асяроддзі беларускай эміграцыі і/або эміграцыі з іншых краін былога СССР;
- выявіць, як беларусы ўспрымаюць суседнія дзяржавы і народы ў кантэксце іх адносін з Беларуссю і беларусамі, а таксама культурнай дыстанцыі/блізкасці;
- ідэнтыфікаваць дзяржаўныя і культурна-палітычныя традыцыі, у рамках якіх яны шукаюць сваю ідэнтычнасць;
- вывучыць стаўленне беларусаў у Польшчы да бягучых падзеяў, датычных расійскай агрэсіі ва Украіне, і да ролі Беларусі ў гэтым пытанні.

Доступ да беларускай супольнасці рэалізоўваўся праз розныя каналы, што зрабіла магчымым атрыманне максімальна шырокай карціны і ўліку розных меркаванняў. Праз беларускія грамадскія і моладзевыя арганізацыі, культурныя і навуковыя цэнтры распаўсюджвалася анлайн-апытанне на трох мовах (беларускай, рускай і польскай). Таксама анкета была даступная ў транспартных вузлах і ў месцах збору беларускай супольнасці. Дзякуючы прынятым захадам удалося сабраць вялікую даследчую выбарку (N=1299). Дэталёва прааналізаваная і правераныя дадзеныя выявіліся паслядоўнымі і далі шмат цікавых вынікаў, якія прадстаўлены ў рапарце.

Побач з вынікамі даследавання польскай грамадскай думкі дадзены рапарт дае ўяўленне пра бягучы стан грамадскай свядомасці ў польска-беларускіх адносінах, ухопленай ў драматычны для Беларусі і нялёгкі для Польшчы момант. Веданне таго, як бачаць гэтыя з'явы беларусы, што знаходзяцца ў Польшчы, здаецца асабліва каштоўным у планаванні грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі дзеянняў, адрасаваных гэтай супольнасці.

# 2. Інфармацыя пра даследаванне

## Метадалогія

ПАМЕР ВЫБАРКІ **1299** РЭСПАНДЭНТЫ

### Метад правядзення апытання::

Даследаванне насіла характар колькаснага вымярэння, рэалізаванага метадам анкетавання – анкеты самастойна запаўняліся рэспандэнтамі, якія атрымлівалі доступ да іх праз анлайн-спасылку (анкета CAWI).

Рэспандэнты мелі магчымасць выбраць адну з трох моўных версій анкеты: беларускую, рускую і польскую. Выбар моўных версій выглядае наступным чынам:

- беларуская версія **50%**
- руская версія **34%**
- польская версія **16%**

### Вымярэнне праводзілася:

Даследаванне праводзілася з 16.05 па 01.06.2023.

### Рэспандэнты і геаграфія:

Даследаванне праводзілася на агульнай выбарцы з 1299 дарослых грамадзянаў Беларусі, якія ў цяперашні час знаходзяцца ў Польшчы.

### Дадатковая інфармацыя:

На частцы графікаў дадзеныя не складаюцца ў 100%. Такая сітуацыя ўзнікае ў выніку пытанняў з некалькімі магчымымі адказамі. Для пытанняў з адным магчымым адказам мінімальныя адхіленні ад 100% звязаныя з акругленнем адсоткаў.

## Інфармацыя пра рэспандэнтаў

↓ ГРАФІК 1:

### *Пол*




↓ ГРАФІК 2:

### *Узрост*



ГРАФІК 3:

## Адукацыя




ГРАФІК 4:

## Месца паходжання – вобласць у Беларусі



ГРАФІК 5:

## *Знаходжанне ў Польшчы – ваяводства*

| | |
|---|---|
| Ніжнесілезскае | 17% |
| Куяўска-Паморскае | 1% |
| Люблінскае | 1% |
| Любушскае | 0% |
| Лодзінскае | 5% |
| Малапольскае | 11% |
| Мазавецкае | 38% |
| Апольскае | 0% |
| Падкарпацкае | 0% |
| Падляскае | 4% |
| Паморскае | 10% |
| Сілезскае | 2% |
| Свентакшыскае | 0% |
| Вармінска-Мазурскае | 1% |
| Велікапольскае | 7% |
| Заходнепаморскае | 2% |

↓ ГРАФІК 6:

## *Дата пачатку цяперашняга знаходжання ў Польшчы*



3

# Знаходжанне ў Польшчы

*Асноўнай прычынай ад'езду са сваёй краіны для большасці беларусаў, якія цяпер знаходзяцца ў Польшчы, з'яўляецца страх перад рэпрэсіямі ў Беларусі (86%).*

Ёсць і іншыя прычыны, якія апытаныя беларусы зазначалі незалежна або адначасова са страхам рэпрэсій. Для паловы апытаных Польшча – краіна, дзе ў цэлым жывецца лепш, чым у Беларусі. Таму таксама амаль кожны пяты анкетаваны адзначае лепшыя ўмовы для кар'ернага росту дзякуючы магчымасці знайсці больш высокааплатную працу або працу, больш адпаведную кваліфікацыям і інтарэсам. У сваю чаргу, **13%** адзначаюць магчымасць навучання ў польскім універсітэце. Для **14%** рэспандэнтаў прычынай ад'езду былі сябры і знаёмыя ў Польшчы, у той час як **7%** аргументуюць прыезд польскім знаходжаннем сям'і.

↓ ГРАФІК 7:

## Прычыны пераезду з Беларусі ў Польшчы



Прычынай ад'езду з Беларусі, на якую часта спасылаліся апытаныя ў спантанна запісаных каментарах пад адказам "іншае", была вайна ва Украіне. У частцы такога кшталту заўваг рэспандэнты акцэнтавалі нежаданне падтрымліваць гэтую агрэсію нават праз аплату падаткаў у Беларусі – у дзяржаве, якая з'яўляецца хаўруснікам Расіі. Для часткі апытаных вайна ва Украіне – досвед яшчэ больш асабісты, бо іх дарога ў Польшчу вяла праз Украіну, куды яны з'ехалі з Беларусі пасля фальсіфікаваных выбараў, і ўжо адтуль, пасля пачатку вайны, пераехалі ў Польшчу.

Сярод іншых прычын, спантанна запісаных рэспандэнтамі, таксама гучыць водгулле пераезду ў Польшчу з Беларусі супрацоўнікаў IT-сектара. Вялікая колькасць каментароў змяшчае інфармацыю, якая можа ўказваць на тое, што яны былі напісаныя праграмістамі. Часам найпрост гаворыцца, напрыклад, пра тое, што ў Польшчу пераехала цэлая IT-кампанія, якая раней мела шмат кантрактаў з замежнымі кампаніямі, а пасля ўвядзення санкцый гэтыя рынкі былі адрэзаныя.

*"Я пераехаў з Беларусі ва Украіну напрыканцы 2020 года, але з пачаткам вайны пераехаў у Польшчу".*

*"Рэалізавацца ў маёй прафесіі (IT) стала немагчыма ў Беларусі".*

*"Крымінальны пераслед у Рэспубліцы Беларусь за пратэсты супраць нелегітымнай улады і беззаконня".*

*"Калегі майго мужа трапілі ў турму. Кампанія, у якой ён працаваў, пераехала ў Польшчу. Нашу дачку дапытвалі ў КДБ. Мы баяліся пераследу за ўдзел у мірных пратэстах. Таму мы пераехалі ў Польшчу".*

*"Вайна ва Украіне, пераезд IT-кампаніі з Беларусі ў Польшчу".*

*"Я не хачу спансіраваць вайну з Украінай".*

*"Немагчымасць атрымліваць заробак ад замежнага працадаўцы на беларускі банкаўскі рахунак пасля 24.02.2022".*

Амаль палова апытаных беларусаў заяўляе, што не хоча вяртацца ў Беларусь, з іх **45%** апытаных плануюць застацца ў Польшчы на пастаяннае пражыванне. **5%** апытаных маюць намер пераехаць у іншую краіну. Штопяты апытаны кажа, што хоча вярнуцца ў Беларусь, калі сітуацыя дазволіць, і толькі **1%** рэспандэнтаў заяўляе пра сваё жаданне вярнуцца ў Беларусь найбліжэйшым часам.

↓ ГРАФІК 8:

## *Планы на далейшае знаходжанне ў Польшчы*

- Я хачу застацца ў Польшчы на пастаяннае пражыванне — **45%**
- Я хачу вярнуцца ў Беларусь, калі дазволіць сітуацыя — **22%**
- Я хачу з'ехаць з Польшчы ў іншую краіну, але не хачу вяртацца ў Беларусь — **5%**
- Я хачу вярнуцца ў Беларусь у найбліжэйшай будучыні — **1%**
- Пакуль не ведаю, не вызначыўся (не вызначылася) з далейшымі планамі — **28%**



*"Польшча, як і Беларусь, з'яўляецца спадчынніцай нашай роднай Рэчы Паспалітай Абодвух Народаў, але Польшча была значна менш знявечаная расійскімі захопнікамі і лепш захавала культуру Рэчы Паспалітай, таму я адчуваю сябе больш дома ў Польшчы, чым у зрусіфікаванай Беларусі".*

*"Працяг дзейнасці ў інтарэсах беларускай культуры і правоў чалавека".*

Беларусы ў Польшчы наогул добра ацэньваюць знаходжанне ў Польшчы – адна трэцяя рэспандэнтаў нават карыстаецца ацэнкай “вельмі пазітыўна”. Толькі **2%** апытаных ацэньваюць знаходжанне негатыўна.

↓ ГРАФІК 9:

## *Ацэнка знаходжання ў Польшчы*




Для большасці апытаных самай вялікай праблемай знаходжання ў Польшчы было вырашэнне адміністратыўных пытанняў. Пра нязначныя ці сур’ёзныя праблемы ў гэтай сферы заявіла **70%** рэспандэнтаў. Яшчэ адной праблемай для большасці беларусаў выявілася ўсталяванне сацыяльных кантактаў і сяброўскіх стасункаў з палякамі (**64%**) і пошук жылля ў арэнду (**60%**). Для большасці апытаных беларусаў не сталі праблемай магчымасць вывучэння польскай мовы (**56%**) і доступ да інфармацыі, неабходнай для штодзённага жыцця і эфектыўнага функцыянавання ў Польшчы (**54%**)

↓ ГРАФІК 10:

## *Праблемы, звязаныя са знаходжаннем у Польшчы*






Згаданае вышэй пытанне, хоць і змяшчала гатовыя прапановы адказу (закрытае пытанне), давала максама апытаным магчымасць запісаць у анкеце ўласныя каментары ў катэгорыі "іншыя праблемы". Аналіз гэтых спантанных каментароў рэспандэнтаў дае яшчэ больш цікавыя высновы. Мы даведаемся, сярод іншага, што грамадзяне Беларусі ў Польшчы часам адчуваюць горшае стаўленне ці нават дыскрымінацыю ў дачыненні да сябе. Такое пачуццё, здаецца, суправаджае апытаных як у фармальных абставінах (бюракратыя), так і ў штодзённым жыцці і сацыяльных кантактах. Рэспандэнты скардзяцца, напрыклад. на цяжкасці ў банкаўскай сферы, дзе пасля прад'яўлення беларускага пашпарта немагчыма адкрыць рахунак. Горш, чым, напрыклад, на ўкраінцаў глядзяць на іх польскія чыноўнікі, калі справа даходзіць да вырашэння розных спраў. У гэтым кантэксце, безумоўна, самая вострая праблема – вельмі доўгі час чакання віду на жыхарства, які мог расцягнуцца нават на два гады.

Цікава, што негатыўнае стаўленне да беларусаў апытаныя адчуваюць таксама – і нават часцей, чым з боку палякаў – з боку ўкраінцаў у Польшчы. Украінцы, на думку рэспандэнтаў, не ставяцца да іх прыязна, а таксама, паводле апытаных, маюць у Польшчы шмат прывілеяў, недаступных беларусам.

Адносна часта паўтараецца ў каментарах тэма праблем з сістэмай аховы здароўя – немагчымасць трапіць да дактароў агульнай практыкі і спецыялістаў.

Беларусы, якія пражываюць у Польшчы, часта вымушаныя мірыцца з расстаннем са сваімі блізкімі, якія дагэтуль жывуць у Беларусі. Гэта адна з многіх прычын, чаму адаптацыя да польскага жыцця часам працякае з цяжкасцямі – як для саміх апытаных, так і для іх дзяцей. Усё гэта спараджае неабходнасць доступу не толькі да дактароў-тэрапеўтаў і спецыялістаў, але і да псіхолагаў. Праблемы ў гэтай сферы рэспандэнты таксама пазначалі ў сваіх каментарах.

*“Пошук працы, цяжкасці з вывучэннем польскай мовы – курсы і вакансіі ў першую чаргу адкрытыя для ўкраінцаў, беларусы застаюцца па-за сістэмай, без увагі”.*

*“Псіхічны стан дзяцей, іх адаптацыя да Польшчы”.*

*“Я чакаю від на жыхарства, каб застацца ў Вроцлаве, ужо два гады. Я не магу ўладкавацца на працу або паехаць у адпачынак, не магу набыць кватэру і планаваць сваё жыццё!”*

*“Цяжкасць у пошуку псіхалагічнай дапамогі”.*

*“Я не магу запрасіць бацькоў да сябе. Асоба, якая мае візу або часовы від на жыхарства, не мае права пісаць запрашэнне. Іншага спосабу атрымаць візу для бацькоў, якія засталіся ў Беларусі, няма”.*

*“Жонка мае расійскі пашпарт і не мае магчымасці знайсці працу”.*

*“Дыскрымінацыя і непавага”.*

*“Поўная адсутнасць беларускай мовы ў якасці мовы апісання/суправаджэння чаго-колечы: прынамсі, у музеі, прынамсі, у крамах/супермаркетах”.*

*“Цяжкасці з сацыялізацыяй. Многія палякі з пагардай ставяцца да беларусаў і ўкраінцаў”.*

*“Дыскрымінацыя з боку ўкраінцаў пасля пачатку вайны, агрэсія”.*

*“Негатыўнае стаўленне з боку ўкраінцаў, вельмі цяжка знаходзіць сяброў і знаёміцца наогул”.*

*“Я не магу прызвычаіцца да гэтага, проста ў палякаў іншая ментальнасць”.*

Польшча ўжо больш за дзесяць гадоў выдае гэтак званую “карту паляка” грамадзянам, у т.л. Беларусі, якія заяўляюць аб сваёй прыналежнасці да польскага народа. **90%** апытаных беларусаў лічаць, што гэта добры інструмент, які дазваляе падтрымліваць палякаў, якія пражываюць у Беларусі, без негатыўнага ўплыву на сітуацыю іншых грамадзянаў Беларусі. Толькі **7%** апытаных лічаць, што такая падтрымка ажыццяўляецца за кошт іншых грамадзянаў Беларусі.

↓ ГРАФІК 11:

## *Меркаванне на тэму карты паляка*




*“Праблема з доступам да вузкіх дактароў-спецыялістаў, вельмі высокія падаткі”.*

*“Працяг дзейнасці па арганізацыі грамадзянскай супольнасці пасля пераезду з Беларусі ў Польшчу – адсутнасць дастатковых сродкаў на інстытуцыянальнае функцыянаванне, адміністрацыйныя выдаткі, прыняцце ў штат супрацоўнікаў”.*

*“Праблема – гэта польскае медыцынскае абслугоўванне”.*

*“Асабістае жыццё. Я падаўлены, я самотны”.*

4

# Адаптацыя ў Польшчы

*Толькі 2% рэспандэнтаў заяўляюць, што не цікавяцца бягучымі падзеямі ў Польшчы і свеце. Пераважная большасць (96%) імкнецца сачыць за падзеямі на пастаяннай аснове.*

Найбольшы працэнт апытаных (**65%**) выкарыстоўвае ў асноўным СМІ/сацыяльныя сеткі, звязаныя з беларускай эміграцыяй. У сваю чаргу, кожны пяты рэспандэнт выкарыстоўвае для гэтай мэты ў асноўным СМІ на польскай мове, у той час як кожны дзясяты глядзіць у асноўным заходнія СМІ (на англійскай ці іншай заходняй мове). Найменшай папулярнасцю карыстаюцца афіцыйныя беларускія і/або расійскія СМІ, якія выкарыстоўваюцца для азнаямлення з бягучымі падзеямі толькі **2%** апытаных беларусаў.

↓ ГРАФІК 12:

## Каналы інфармавання пра бягучыя падзеі ў Польшчы і свеце

- Я стараюся быць у курсе таго, што адбываецца ў Польшчы і за мяжой, выкарыстоўваючы ў асноўным СМІ/сацыяльныя сеткі, звязаныя з беларускай эміграцыяй — **65%**
- Я стараюся быць у курсе таго, што адбываецца ў Польшчы і за мяжой, выкарыстоўваючы ў асноўным СМІ на польскай мове — **20%**
- Я стараюся быць у курсе таго, што адбываецца ў Польшчы і за мяжой, выкарыстоўваючы ў асноўным заходнія СМІ (на англійскай або іншай заходняй мове) — **9%**
- Я стараюся быць у курсе таго, што адбываецца ў Польшчы і за мяжой, выкарыстоўваючы ў асноўным афіцыйныя СМІ Беларусі і (або) Расіі — **2%**
- Я не сачу за падзеямі ў Польшчы і за мяжой, яны для мяне нецікавыя — **2%**
- Нічога з вышэйпералічанага, не ведаю, адмаўляюся адказваць — **2%**



Большасць беларусаў, якія пражываюць у Польшчы (73%), заяўляюць, што больш за ўсё часу па-за домам бавяць з іншымі беларусамі, з якіх 45% — з беларусамі, якія пражываюць у Польшчы, і 27% – з беларусамі і прадстаўнікамі іншых народаў былога Савецкага Саюза. Рашуча менш, то-бок 20% апытаных, гавораць, што больш за ўсё часу бавяць па-за домам з палякамі. Прычынай гэтага можа быць моўны бар'ер. Шырока распаўсюджанай мовай у Беларусі з'яўляецца руская мова, таму таксама апытаныя заяўлялі, што яны часцей бавяць час у асноўным з беларусамі і/або іншымі рускамоўнымі людзьмі.

↓ ГРАФІК 13:

## З кім беларусы, якія пражываюць у Польшчы, праводзяць найбольш часу па-за домам?




Прыведзеныя вышэй вынікі пацвярджаюцца вынікамі, атрыманымі ў наступным пытанні. Выяўляецца, часцей і больш ахвотна рэспандэнты сустракаюцца са сваімі суайчыннікамі або з іншымі людзьмі, якія гавораць па-руску.

↓ ГРАФІК 14:

## У якім асяроддзі беларусы, якія пражываюць у Польшчы, праводзяць найбольш часу?



Планы на далейшае знаходжанне ў Польшчы



*Я хачу застацца ў Польшчы на пастаяннае пражыванне*

**45 %**



*Я хачу вярнуцца ў  Беларусь, калі дазволіць сітуацыя*

**22 %**

*Крыху больш за палову апытаных (56%) не падтрымліваюць кантакты з беларускімі арганізацыямі, якія працуюць у Польшчы.*

Гэта азначае, што амаль палова такіх кантактаў не мае, і гэта можа растлумачыць частку адаптацыйных цяжкасцяў. Гаворачы пра праблемы, з якімі сутыкаюцца апытаныя падчас знаходжання ў нашай краіне, гучалі, сярод іншага, згадкі пра адсутнасць доступу да інфармацыі на беларускай або рускай мовах. Беларускія арганізацыі, натуральна, могуць і, безумоўна, у значнай ступені запаўняюць гэты прабел. Маштаб беларускай эміграцыі таксама патрабуе выпрацоўкі адпаведных падыходаў у польскіх арганізацыях – там імігранты з Беларусі маглі б знайсці чаканую дапамогу.

ГРАФІК 15:

## Кантакт з беларускімі арганізацыямі ў Польшчы



5

# Моўныя пытанні

*Большасць апытаных беларусаў лічаць, што ў канчатковым выніку адзінай афіцыйнай мовай у Беларусі павінна быць беларуская мова.*

Больш за палову (52%) кажуць, што гэту змену трэба ажыццявіць як мага хутчэй, у той час як 34% лічаць, што трэба пачакаць, пакуль людзі не вывучаць беларускую мову. Пераважная меншасць лічыць, што Беларусь павінна заставацца двухмоўнай краінай.

↓ ГРАФІК 16:

## Меркаванне на тэму рускай мовы як афіцыйнай у Беларусі




Нягледзячы на прыведзеныя вышэй адказы, менавіта руская мова, здаецца, найбольш ужываная сярод беларусаў. Апытаныя часцей за ўсё заяўляюць, што дома ў Беларусі і цяпер у размовах з сям'ёй і роднымі найчасцей выкарыстоўваюць рускую мову (58% і 43% адпаведна) або рускую і беларускую (35% і 40% адпаведна). Разам з тым у названых сітуацыях значна радзей рэспандэнты заяўлялі, што гавораць толькі на беларускай мове — 5% дома ў Беларусі і 10% цяпер у размовах з сям'ёй і роднымі.

Аналагічныя вынікі былі атрыманыя адносна кантактаў з сябрамі/знаёмымі. У гэтай групе апытаных рэспандэнты часцей за ўсё выкарыстоўваюць рускую і беларускую мовы (35%) і выключна рускую (41%).

↓ ГРАФІК 17:

## *Мова, ужываная ў розных абставінах і стасунках*



Беларусы часцей за ўсё заяўляюць аб валоданні мовамі: рускай (**98%**), беларускай (**96%**), англійскай (**89%**) і польскай (**89%**). Моўныя праблемы таксама згадваліся ў кантэксце праблем, з якімі апытаныя сутыкаюцца падчас знаходжання ў нашай краіне. Рэспандэнты скардзіліся, сярод іншага, на дрэннае веданне замежных моў польскімі чыноўнікамі і дзяржаўнымі служачымі. Пераважная большасць рэспандэнтаў, нават калі б не па-руску, была б у стане паразумецца па-англійску, бо веданне гэтай мовы ў групе апытаных вельмі высокае.

ГРАФІК 18:

## *Веданне моваў (прынамсі на базавым узроўні)*



Меркаванне на тэму Расіі і расіянаў

***Беларусь, калі дала сваю тэрыторыю ў распараджэнне ўзброеных сіл Расійскай Федэрацыі, уступіла ў вайну супраць Украіны на баку Расіі***

# 73%



Большасць апытаных, якія заяўляюць, што ведаюць польскую мову, сцвярджаюць, што ведаюць яе дрэнна (**40%**) і могуць паразумецца толькі ў простых пытаннях штодзённага жыцця. Крыху менш (**34%**) гавораць, што ведаюць польскую мову дастаткова добра, то-бок разумеюць амаль усё і размаўляюць па-польску. Адна пятая анкетаваных (**21%**) лічыць, што свабодна валодае польскай мовай — свабодна чытае і размаўляе.

↓ ГРАФІК 19:

## *Ацэнка ведання польскай мовы*




- Я не ведаю польскай мовы
- Ведаю слаба. Магу камунікаваць па нязначных пытаннях штодзённага жыцця
- Я ведаю польскую мову дастаткова добра. Я разумею амаль усё і камунікую на польскай мове
- Ведаю свабодна. Я магу свабодна чытаць і размаўляць
- Польская мова з'яўляецца маёй роднай мовай

Пераважная большасць людзей, якія не ведаюць польскай мовы ці дрэнна яе ведаюць (**95%**), гавораць пра неабходнасць вывучэння нашай мовы.

↓ ГРАФІК 20:

## *Патрэба вывучэння польскай мовы*




- Безумоўна так (**0%**)
- Хутчэй так
- Хутчэй не
- Безумоўна не
- Не ведаю, цяжка сказаць

Галоўнай прычынай жадання вывучаць польскую мову з'яўляецца жаданне больш свабодна камунікаваць з палякамі, а таксама жаданне больш поўнага ўдзелу ў культурным і грамадскім жыцці Польшчы.

↓ ГРАФІК 21:

## *Прычыны адчування патрэбы вывучаць польскую мову*

- Я хацеў (хацела) б ведаць польскую мову, каб лепш камунікаваць з людзьмі ў Польшчы — 58%
- Веданне польскай мовы дапаможа мне даведацца больш пра культуру і сацыяльнае жыццё ў Польшчы — 16%
- Польская мова карысная/неабходная ў маёй працы ў Польшчы — 14%
- Польская мова – гэта мова маіх продкаў — 7%
- Польская мова – мова маіх родных (мужа/жонкі/партнёра/партнёркі) — 1%
- Іншая прычына — 4%



6

# Ацэнка стаўлення суседзяў да Беларусі

Па пяцібальнай шкале (ад “вельмі непрыязна” да “вельмі прыязна”) рэспандэнты ацэньвалі, як, на іх думку, ставяцца да Беларусі-дзяржавы і да грамадзянаў Беларусі ўлады асобных дзяржаў-суседак Беларусі і самі грамадзяне гэтых дзяржаў.

Як выявілася, нягледзячы на тое, што Беларусь уцягнутая ў агрэсію Расіі ва Ўкраіне, большасць апытаных лічаць, што польскі бок захоўвае ў дачыненні да Беларусі сяброўскае стаўленне.

*Больш за тое, з усіх пяці суседзяў Беларусі менавіта Польшча лічыцца найбольш прыязнай да Беларусі.*

А вось самай непрыязнай у адносінах да Беларусі дзяржавай, на думку апытаных, з'яўляецца Расія. І гэта нягледзячы на фактычнае супрацоўніцтва ўладаў дзвюх краін. Рэспандэнты, як выяўляецца, не падманваюць сябе тым, што за рэалізаваным супрацоўніцтвам і заяўленым сяброўствам стаяць пазітыўныя намеры.

↓ ГРАФІК 22:

## Меркаванне на тэму стаўлення ўладаў асобных дзяржаў да Беларусі



Меркаванне на тэму Расіі
і расіянаў

*Украіна стала ахвярай узброенай агрэсіі з боку Расійскай Федэрацыі*

# 98 %



Існуюць істотныя адрозненні паміж тым, як рэспандэнты ацэньваюць стаўленне ўладаў асобных дзяржаў і стаўленне народаў. Пры ацэнцы адносінаў асобных народаў да беларусаў у кожным выпадку пераважаюць указанні на сяброўскае стаўленне. У выпадку з расіянамі гэтая перавага адносна невялікая (ад **39%** да **34%**).

Безумоўна, найбольш прыязным народам у адносінах да беларусаў, на думку апытаных, з'яўляюцца палякі – толькі **2%** апытаных прытрымліваюцца іншага меркавання.

У выпадку з украінцамі меркаванае стаўленне да беларусаў ужо не такое адназначнае. Што праўда, большасць апытаных, а гэта **48%**, лічыць, што ўкраінцы прыязна ставяцца да беларусаў, але ўжо **20%** прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання.

↓ ГРАФІК 23:

## *Меркаванне на тэму стаўлення асобных народаў да беларусаў*



Апытаныя, аднак, інакш бачаць культурную блізкасць паміж асобнымі народамі. У гэтым выпадку рэспандэнты практычна не сумняюцца, што ўкраінцы ім вельмі блізкія. Амаль ідэнтычныя паказнікі ў рэйтынгу культурнай блізкасці паміж народамі атрымалі і ўкраінцы, і палякі – гэтыя народы, на думку апытаных, безумоўна, культурна блізкія беларусам.

У сваю чаргу, найслабейшыя культурныя сувязі беларусы адчуваюць у дачыненні да латышоў і расіянаў.

↓ ГРАФІК 24:

## *Які народ найбліжэйшы беларусам?*



Анкетаваных спыталі, з якой гістарычнай і дзяржаўнай традыцыі сучасная Беларусь і самі беларусы павінна чэрпаць больш за ўсё. Як выявілася, для самай вялікай групы (**46%**) гэта Вялікае Княства Літоўскае, дадаткова **16%** апытаных адзначыла ў гэтым кантэксце Рэч Паспалітую. Для адной траціны апытаных такіх крыніц варта шукаць у пазнейшай гісторыі – яны пазначылі варыянт "Беларуская Народная Рэспубліка".

↓ ГРАФІК 25:

## *З якой гістарычнай і дзяржаўнай традыцыі сучасная Беларусь і беларусы павінны чэрпаць больш за ўсё?*

- Вялікае Княства Літоўскае **46%**
- Беларуская Народная Рэспубліка **30%**
- Рэч Паспалітая **16%**
- Савецкі Саюз/Беларуская ССР **0%**
- Расійская імперыя **0%**
- Гэтак званы «рускі свет» **0%**
- Не ведаю, не маю меркавання, цяжка сказаць **8%**



7

# Расія і расіяне

Пераважная большасць беларусаў негатыўна ацэньвае адносіны Беларусі і Расіі.

> *82% анкетаваных не згодныя са сцвярджэннем, што беларусы і расіяне – гэта два найбольш блізкія адзін да аднаго народы,*

у той час як чацвёра з пяці рэспандэнтаў лічаць, што беларусы ў культурных адносінах значна бліжэйшыя да літоўцаў і палякаў, чым да расіянаў.

Апытаныя таксама негатыўна ацэньваюць ваенныя дзеянні, якія праводзяцца Расіяй ва Украіне. На думку **98%** апытаных, Украіна з'яўляецца ахвярай гэтага канфлікту. Акрамя таго, пераважная большасць (**96%**) не згодная са сцвярджэннем, што землі, за якія змагаецца Расія, належаць ёй, бо некалі яны былі часткай расійскай дзяржавы.

У кантэксце агрэсіі ва Украіне апытаныя крытычна ацэньваюць не толькі ўлады Расіі, але і саміх расіянаў. Больш чым палова апытаных (**53%**) не згодная са сцвярджэннем, што звычайныя расіяне не маюць уплыву на дзеянні сваіх уладаў і таму не могуць быць абвінавачаныя ў злачынствах рэжыму. Больш за тое, да **70%** апытаных наўпрост кажуць: калі расіяне ў большасці падтрымліваюць Пуціна, то і на іх ускладаецца адказнасць за яго палітыку.

Падобнае крытычнае стаўленне апытаныя маюць да ўласнай дзяржавы – большасць апытаных (**73%**) прытрымліваецца пазіцыі аб тым, што, даўшы доступ да сваёй тэрыторыі ўзброеным сілам Расіі, Беларусь дэфакта ўступіла ў вайну супраць Украіны.

↓ ГРАФІК 26:

## Меркаванне на тэму Расіі і расіянаў



- Паколькі расіяне ў большасці сваёй падтрымліваюць рэжым Уладзіміра Пуціна, яны таксама падзяляюць адказнасць за яго злачынствы




- Простыя расіяне не маюць ніякага ўплыву на дзеянні сваіх уладаў, таму іх цяжка абвінаваціць у злачынствах пуцінскага рэжыму




- Беларусы і расіяне – два найбольш блізкія адзін да аднаго народы




- Расію можна зразумець: яна хоча вярнуць землі, якія належалі ёй стагоддзямі




Цалкам згодны (згодная)

Хутчэй не згодны (не згодная)

Ані згодны (згодная), ані не згодны (не згодная)

Хутчэй згодны (згодная)

Цалкам згодны (згодная)

Цяжка сказаць

Прычыны пераезду з Беларусі ў Польшчы

## *Страх перад рэпрэсіямі ў Беларусі*

# 86 %



# 8. Падсумаванне

**Супольнасць беларусаў, якія прыехалі ў Польшчу ў апошнія гады, выяўляецца вельмі згуртаванай і згоднай у сваіх поглядах на палітычныя, нацыянальна-моўныя і гісторыка-культурныя пытанні. Перад намі не зрэз усяго беларускага грамадства, не "Беларусь у мініяцюры", а супольнасць эмігрантаў з выразнымі, даволі адназначнымі поглядамі, якім няма месца ў сучаснай беларускай дзяржаве.**

Гэтую асноўную, у некаторай ступені відавочную канстатацыю тут варта асабліва падкрэсліць, каб не разглядаць атрыманыя вынікі як рэпрэзентатыўныя для ўсіх грамадзянаў Беларусі. Аднак разам з тым карціна поглядаў і вопыту, якая ўзнікае з аналізу гэтага апытання, многае гаворыць пра стан свядомасці пэўнай часткі беларускага грамадства – маладых людзей ці людзей у росквіце веку, у асноўным з вышэйшай адукацыяй, жыва зацікаўленых бягучымі падзеямі, якія выступаюць супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі.

Асноўнай матывацыяй іх прыезду ў Польшчу з'яўляецца страх перад палітычнымі рэпрэсіямі: ужо часткова перанесенымі або меркаванымі як магчымасць у будучыні. Польшча для іх – натуральны выбар, месца прытулку, новая прастора для жыцця.

Часам гэтаму спадарожнічаюць прафесійныя прычыны (асабліва ў кантэксце санкцыйных абмежаванняў для некаторых сфер, у прыватнасці, для IT-сектара). Цяжка, аднак, не скласці ўражання, што справа тут не ў звычайнай эканамічнай матывацыі. Пошук "лепшага жыцця" тут мае хутчэй моцны цывілізацыйна-культурны кантэкст. Беларусь у яе цяперашнім выглядзе не з'яўляецца для рэспандэнтаў даследавання месцам, дзе можна далей трываць. Агрэсія Расіі ва Украіне і ўцягванне ў яе Беларусі – фактар, які ў многіх выпадках паскорыў рашэнне аб ад'ездзе.

Погляды апытаных можна было б коратка акрэсліць як адназначна антысавецкія, моцна антырасійскія, сугучныя духу спадчыны Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Прастора, у якой яны знаходзяць сябе і на якую хочуць спасылацца, безумоўна, не з'яўляецца аніякай версіяй "рускага свету". Гэта людзі з выразна сфарміраванай беларускай нацыянальнай і моўнай ідэнтычнасцю, якія адчуваюць моцную культурную і гістарычную сувязь з Польшчай.

Іх знаходжанне ў Польшчы, хоць і ацэньваецца станоўча і плануецца на больш працяглы тэрмін, не пазбаўлена праблем. У іх лік уваходзяць цяжкасці з доступам да медыцынскіх паслуг, улучна з псіхалагічнай дапамогай, а таксама бюракратычныя бар'еры. Варта таксама адзначыць тут з'яву, якая адсочваецца ў некаторых адкрытых каментарах рэспандэнтаў і якую можна было б ахарактарызаваць як "патрэба ў большай увазе". Гаворка, з аднаго боку, ідзе пра практычныя пытанні (напрыклад, пра адсутнасць беларускай мовы ў грамадскай прасторы), а з іншага, пра агульнае стаўленне польскіх уладаў і ўстаноў да імігрантаў з Беларусі. На фоне ўзнікае некаторае напружанне ўдачынах з бежанцамі з Украіны, стаўленне да якіх, на думку некаторых рэспандэнтаў, лепшае, адзначанае большай увагай і зычлівасцю. Сітуацыя тым больш складаная ў святле таго, што супраціў расійскай агрэсіі ва Украіне аб'ядноўвае супольнасць беларускай эміграцыі і стаў для многіх рэспандэнтаў адной з прычын ад'езду з радзімы. Выяўленае тут патэнцыйнае напружанне, безумоўна, патрабуе ўвагі польскіх інстытуцый і арганізацый.

Нягледзячы на гэтыя праблемы, большасць анкетаваных звязвае з Польшчай сваю найбліжэйшую будучыню і добра ацэньвае сваё пражыванне ў Польшчы. Дадзеныя, сабраныя падчас даследавання, паказваюць вялікія аб'ёмы сацыяльнага капіталу, які можа прынесці ў Польшчу асяроддзе новай беларускай эміграцыі. Згоднасць поглядаў гэтага асяроддзя, іх супадзенне з польскім бачаннем фарміравання адносін з народамі Усходняй Еўропы, заяўленая культурная і эмацыйная блізкасць ствараюць для гэтага трывалую аснову.



Новая беларуская эміграцыя ў Польшчы – тэма менш заўважная. Гэта вынікае як з маштабу з'явы (дзясяткі тысяч беларусаў у параўнанні з некалькімі мільёнамі грамадзянаў Украіны, што прыбылі ў Польшчу), так і са зразумелага ва ўмовах вайны засяроджвання ўвагі польскай грамадскай думкі на ўкраінцах як на яе непасрэдных ахвярах. Аднак наплыў беларусаў, які ўзрастаў са жніўня 2020 года і ўзмацняўся разам з павышэннем рэпрэсіўнасці рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, выявіўся гэтак сама важным складнікам новага грамадскага краявіду,што ўтвараецца ў Польшчы ў сувязі з падзеямі на ўсход ад польскіх межаў. Дадзены рапарт даследавання меркавання беларусаў у Польшчы дае ўяўленне пра бягучы стан грамадскай свядомасці ў польска-беларускіх адносінах, ухоплены ў драматычны для Беларусі і нялёгкі для Польшчы момант. Веданне таго, як бачаць гэтыя з'явы беларусы, што знаходзяцца ў Польшчы, здаецца асабліва каштоўным у планаванні грамадскімі арганізацыямі і дзяржаўнымі ўстановамі дзеянняў, адрасаваных гэтай супольнасці.

Цэнтр дыялогу
імя Юльюша Мерашэўскага

вул. Ясна 14/16А,
00-041 Варшава, Польшчы
www.mieroszewski.pl

twitter.com/MieroszewskiPL
instagram.com/MieroszewskiPL
facebook.com/MieroszewskiPL
youtube.com/c/MieroszewskiPL

Цэнтр Мерашэўскага – гэта публічная інстытуцыя, створаная ў адпаведнасці з пастановай Сейма Рэспублікі Польшча і падпарадкаваная Міністэрству культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча. Яго асноўнай мэтай з'яўляецца правядзенне, ініцыяванне і падтрымка мерапрыемстваў, скіраваных на будаванне дыялогу паміж палякамі і народамі Усходняй Еўропы, у прыватнасці з украінцамі, беларусамі, грузінамі, малдаванамі, а таксама з тымі расіянамі, якія асуджаюць злачынствы рэжыму Уладзіміра Пуціна. Юльюш Мерашэўскі – адзін з найвыбітнейшых польскіх палітычных пісьменнікаў XX ст. Ён быў прыхільнікам супрацоўніцтва палякаў з іншымі народамі, зняволенымі расійскім і савецкім імперыялізмам.